УДК 930.(476)

*А.А. Савіч*

# АСОБЫ ЗАХОДНЕБЕЛАРУСКАГА НАЦЫЯНАЛЬНА-ВЫЗВАЛЕНЧАГА РУХУ (1921–1939 гг.) У АСВЯТЛЕННІ АЙЧЫННАЙ ГІСТАРЫЯГРАФІІ 1990–2000-х гг.

У артыкуле на падставе шырокага кола гістарыяграфічных крыніц даследаваны пытанні адлюстравання месца і ролі дзеячаў заходнебеларускага нацыянальна-вызваленчага руху 1921–1939 гг. у працах айчынных гсіторыкаў. Савецкая гістарычная навука з яе класавымі і партыйнымі прыярытэтамі рэзка адмоўна ставілася да дзейнасці палітыкаў некамуністычнай арыентацыі ў Заходняй Беларусі, у 1930–1950-я гады нават адданыя кампартыі дзеячы былі рэпрэсіраваны, а іх дзейнасць падавалася як справа агентаў дэфензівы. У часы Рэспублікі Беларусь айчынная гістарыяграфія здолела назапасіць трывалыя падставы навукова-метадалагічнага характару для пераасэнсавання дзейнасці беларускіх палітыкаў, іх гістарычнай рэабілітацыі, уключэння ў кантэкст нацыянальнай гісторыі.

## Уводзіны

Якасна новы перыяд развіцця беларускай гістарычнай навукі, у тым ліку заходнебеларускай гістарыяграфіі, пачаўся ў пачатку 1990-х гадоў пасля распаду СССР і ўстанаўлення незалежнасці Рэспублікі Беларусь, калі ў грамадстве адкрыта праявілася цяга да сапраўднай гісторыі Айчыны, у прыватнасці гісторыі Заходняй Беларусі 1921–1939 гг. Узнікла вострая неабходнасць пераадолення крызісных з'яў і выпрацоўкі новых гісторыка-метадалагічных падыходаў да асэнсавання мінулага. Да таго ж вялікая колькасць разнастайнай навуковай і навукова-папулярнай прадукцыі савецкіх часоў пра «сацыяльнае і нацыянальнае вызваленне», «інтэрнацыянальнае выхаванне», «рэвалюцыйны авангард», з аднаго боку, стварала ілюзорнае ўражанне пра добра вывучаную гісторыю Заходняй Беларусі, з другога – перанасыціла чытача, наводзіла сум і апатыю сваёй відавочнай тэндэнцыйнасцю, заідэалагізаванасцю, завуаляванасцю многіх пытанняў. Паступова пачала фарміравацца ўласнабеларуская мадэль мінулага, усталёўвацца нацыянальна-дзяржаўная канцэпцыя гісторыі Беларусі, якой быў характэрны свой погляд на гісторыю Бацькаўшчыны, пачалі стварацца і прыцягваць увагу даследаванні, якія паглыблялі заходнебеларускую праблематыку, у тым ліку гісторыю дзейнасці нацыянальных палітычных і культурных дзеячаў.

## Адлюстраванне дзейнасці палітычных і культурных дзеячаў Заходняй Беларусі ў 1990–2000-я гады

Важнай прыкметай вывучэння ў 1990–2000-я гады гісторыі нацыянальна-вызваленчага руху Заходняй Беларусі 1921–1939 гг. была яе персаніфікацыя, якая на падставе новых метадалагічных падыходаў дазволіла пашырыць гістарычную рэтраспектыву за кошт асэнсавання індывідуальных духоўных, ідэйна-палітычных аспектаў. Навуковы аналіз узаемаадносін удзельнікаў грамадска-палітычных працэсаў, адносін з афіцыйнымі ўрадавымі і праўрадавымі арганізацыямі, стаўлення да разнастайных дзяржаўных мерапрыемстваў, дыскусій па розных пытаннях палітычнай дзейнасці, асэнсаванне ўплыву на беларускіх дзеячаў на падставе адпаведных ідэалагічных і сацыяльна-эканамічных дактрын, вырашэння фінансава-матэрыяльных пытанняў дазволілі своеасаблівым чынам «ажывіць» гісторыю Заходняй Беларусі. У такім асвятленні сталі больш абгрунтаванымі высновы і зразумелымі паводзіны і ўчынкі актыўных удзельнікаў беларускага нацыянальнага руху. І гэта тычылася не толькі «дазволеных» у савецкія часы біяграфій дзеячаў, такіх як Б. Тарашкевіч, С. Рак-Міхайлоўскі, І. Дварчанін, С. Прыгыцкі і інш. [1], але і тых, дзейнасць якіх не ўпісвалася ва ўсталяваныя дагматы, ста-

раннымі намаганнямі савецкіх гісторыкаў заціралася ў тлум мінулага, – А. Луцкевіча, А. Станкевіча, В. Гадлеўскага, Р. Скірмунта, В. Багдановіча, А. Уласава і інш. [20]. Гэтыя і іншыя палітыкі савецкімі гісторыкамі фактычна былі выключаны з гісторыі беларускага руху, а некаторыя, як, напрыклад, С. Булак-Балаховіч, які ў пачатку 1920-х гадоў з'яўляўся бадай што ключавой фігурай беларускай ваенна-палітычнай іерархіі ў Заходняй Беларусі, і сёння маюць супярэчлівую ацэнку ў сувязі з правядзеннем антысавецкай дзейнасці, у тым ліку звязанай з арганізацыяй вайсковых фарміраванняў супраць пракамуністычных партызанскіх атрадаў [19]. На неабходнасць аб'ектыўнага даследавання асобы С. Булак-Балаховіча звяртаў увагу А. Грыцкевіч [5, с. 93–97]. Архіўныя матэрыялы даюць падставы меркаваць аб арганізаванай супраць С. Булак-Балаховіча аператыўна-агітацыйнай кампаніі па яго ўсемагчымым ачарненні. У рапартах дэфензівы маецца інфармацыя пра мэтанакіраваную дыскрэдытацыю С. Булак-Балаховіча, якая адбывалася ў выніку таго, што «банды, грацуёнцыя ў пасе надгранічным, падаюцца як арганізаваныя Балаховічам паўстанцкія аддзелы, якія змагаюцца з бальшавіцкімі». У выніку гэтага ваенна-палітычнага супрацьстаяння асобныя рэгіёны падвяргаліся нападам, рабаўніцтву, жыхары стэрарызаваны [6, арк. 156].

Нядобразычлівыя адносіны ў дачыненні да дзеячаў, якія першапачаткова дэманстравалі незалежныя ад савецка-бальшавіцкіх структур погляды, адстойвалі асноўныя ідэі беларускай дзяржаўнасці, рэалізаваныя сёння ў выглядзе Рэспублікі Беларусь, маюцца і ў пачатку XXI ст. Пацвярджэннем гэтага з'яўляюцца праявы неабгрунтаванага скептыцызму да дзейнасці беларускіх нацыянальна-дэмакратычных дзеячаў. Разважаючы аб «змене арыенціраў беларускай палітычнай эміграцыі» ў кантэксце разважанняў пра эвалюцыю БСДП і Б. Тарашкевіча, С. Рак-Міхайлоўскага, П. Валошына, П. Мятлы, В.Ф. Гігін кваліфікаваў названых палітыкаў як апазіцыю. Па-першае, наўрад ці яны лічылі сябе эмігрантамі і, жывучы ў Беларусі, хоць і Заходняй, імі не былі. Па-другое, адназначна прыпісваць «беларускай апазіцыі» жаданне канкурыраваць з кампартыяй таксама бачыцца беспадстаўным. Згадаем тут тэорыю двухкарэннасці КП(б)Б і КПЗБ, якая мела месца ў беларускай савецкай гістарыяграфіі 1920-х гадоў. На тэрыторыі Заходняй Беларусі вядомы шматлікія прыклады супрацоўніцтва дэмакратаў і сацыялістаў з кампартыяй. У сярэдзіне 1920-х гадоў беларускія палітычныя сілы ў Польшчы, і не толькі, каардынаваліся функцыянерамі з БССР і ў большых ці меншых памерах знаходзіліся ва ўзаемакантактах з «камуністычным цэнтрам» – КП(б)Б [7, с. 158–160, 176, 177, 187]. Б. Тарашкевіч ва ўспамінах узгадваў пра тое, што беларускія дзеячы Рак-Міхайлоўскі, Рагуля, Кахановіч, Мятла і Валошын ўжо на працягу 1923 г. наведвалі савецкае паўпрэдства ў Варшаве. Сам палітык заявіў аб сваім супрацоўніцтве з камуністамі наступнае: «З партыяй і пад кіраўніцтвам яе я стаў працаваць з вясны 1924 году» [2, № 5, с. 132–133]. Пра трывалыя сувязі іншых дзеячаў з прадстаўнікамі БССР гаварыў Р. Зямкевіч у сваіх рапартах «двуйцы»: «Ярэміч хоча любой цаной зваліць Луцкевіча. Ён мае поўны давер Менска. Ярэміч за савецкія грошы выдае «Вольны сьцяг», у якім аплёўваюцца польскія парадкі, затое хваляцца савецкія парадкі і свабода. Ярэміч цяпер у беларускім руху – самая небяспечная гадзіна» [23].

Не можа быць падтрымана і жаданне прынізіць палітыка-дыпламатычны статус і ролю ўрадаў БНР, якія ім падаюцца ў двукоссі, падкрэсліць яе варожасць у дачыненні да БССР. Наадварот, уважліва аналізуючы дакументы 1920-х гадоў, якія тычацца шматпланавых і шматаспектных узаемадачыненняў БНР і БССР, можна зрабіць лагічную выснову аб своеасаблівай рэабілітацыі і ўспрыняцці БНР і яе структур у партыйна-дзяржаўным асяродку Савецкай Беларусі. Складанасці ж ідэйна-палітычнага выбару, матэрыяльна-тэхнічнага, арганізацыйна-фінансавага характару якраз і падкрэсліваюць станоўчыя, стваральныя справы дзеячаў БНР. Сёння наўрад ці хтосьці будзе аспрэчваць думку, што поспехі нацыянальна-дзяржаўнага будаўніцтва БССР, у тым ліку ўзбуй-

ненне тэрыторыі, у значнай ступені абумоўліваліся прынцыповай пазіцыяй і актыўнай дзейнасцю прадстаўнікоў «беларускай нацыянальна-дэмакратычнай апазіцыі». Тым больш немагчыма пагадзіцца з аўтарскім імкненнем адрадзіць у зменены выглядзе ўсталяваны яшчэ ў 1920-я гады тэзіс аб палітычным банкруцтве і нікчэмнасці «белбурнацаў»: «Ідэалогія нацыянал-дэмакратаў была адарвана ад светапогляду большасці беларускага народа: прэваліраванне нацыянальных патрабаванняў над сацыяльнымі не мела актуальнасці, ва ўсялякім выпадку, для Цэнтральнай і Усходняй Беларусі» [4, № 4, с. 58].

Спагадлівыя ўзаемаадносіны з беларускім дзеячамі мэтанакіравана падтрымліваліся прадстаўнікамі савецкай улады featured рознага ўзроўню. У гэтым сэнсе метадалагічную значнасць маюць звесткі пра падзеі, якія дапамагаюць высветліць матывацыю і паводзіны прадстаўнікоў савецкай дыпламатыі, у тым ліку паўпрэдаў у Польшчы, у дачыненні да беларускага руху, у прыватнасці інфармацыя Р.Р. Лазько і М.М. Мезгі аб стаўленні савецкага кіраўніцтва да беларускага пытання ў Польшчы. Зафіксавана зацікаўленасць савецкага боку аслабленнем Польшчы на яе ўсходніх ускраінах, пагаршэннем беларуска-польскіх адносін, прадпрымаліся захады арганізацыйнага характару, накіраваныя на падтрымку антыпольскіх груп у Заходняй Беларусі. Напрыклад, «Войкаў прасіў тэрмінова павялічыць матэрыяльную дапамогу менавіта радыкальным нацыянальным элементам на гэтай тэрыторыі. У той жа час савецкае кіраўніцтва прыкладала актыўныя намаганні, каб не дапусціць стварэння і ўмацавання нацыянальных аб’яднанняў, гатовых да супрацоўніцтва з польскім урадам» [12, с. 31]. Адзначым, што грэблівыя назвы ў дачыненні да беларускіх дзеячаў «беларускія нацыянал-фашысты», «згоднікі», а таксама звесткі аб фінансаванні беларускіх арганізацый, непадкантрольных КПЗБ, польскай уладай, былі народжаны савецкімі дыпламатамі, якія курыравалі беларускае пытанне ў Польшчы [14]. Пазней гэтая інфармацыя шырока ўжывалася савецкімі гісторыкамі для сцвярджэння думкі аб неахайнасці і амаральнасці «белбурнацаў». «Праз Польшчу з Масквы на Берлін ляжаў галоўны напрамак сусветнай рэвалюцыі, на думку кіраўніцтва УКП(б)», – лічыў Р.Р. Лазько, гаворачы пра спробы савецкага кіраўніцтва рэалізаваць ідэю Камінтэрна – «распароць цяперашнюю польскую дзяржаву па нацыянальных швах» пры дапамозе масавага сялянскага руху і Грамады [10, с. 48]. У выніку прымянення такога кшталту «рэцэптаў» беларускае пытанне рабілася сродкам уздзеяння, дыпламатычнай картай, пры дапамозе і за кошт якой адбывалася ўладкаванне савецка-польскіх адносін [9, с. 53, 202].

Спажывецкія адносіны праваднікоў бальшавіцкай палітыкі ў Заходняй Беларусі пацвярджаюцца архіўнымі матэрыяламі. Так, яшчэ ў канцы верасня 1922 г. у час парламенцкай кампаніі партыйны функцыянер у лісце з Заходняй Беларусі, магчыма, да У.М. Ігнатоўскага, паведамляў цікавую інфармацыю. Паводле яе, аўтар карэспандэнцыі выкарыстаў адзін з лістоў адрасата на імя Т. і Р. (магчыма, Тарашкевіча і Рагулі. – *А.С.*) і асабіста з імі размаўляў, яны вельмі згаворлівыя, «маюць цягу да вас, але баяцца рэпрэсій. Я іх супакоіў. …Пакуль цяжка сказаць, што з імі можна зрабіць. Маё меркаванне: іх знішчаць не ў нашых інтарэсах. Як бы гэта ні было, яны – апазіцыя. У два месяцы іх не апрацуеш, адзінае, што можна зрабіць, – 3-5 уцягнуць да нас, а астатнія стануць абывацелямі. …Кланяйцеся Аляксандру Рыгоравічу (магчыма, А.Р. Чарвякову. – *А.С.*)». Не менш паказальны змест яшчэ аднаго ліста ад 14.12.1922. У ім аўтар, аналізуючы вынікі выбараў у польскі парламент, у дачыненні да беларусаў выказаўся так, што яны «правялі каля 14. У большасці сваёй бясцветныя твары. Будуць марыянеткамі ў руках Луцк… (Антона Луцкевіча. – *А.С.*). Некаторых з іх можна будзе спакусіць у працэсе працы і тым павялічыць свае сілы» [15, арк. 39адв, 49]. Што і было зроблена праз некалькі гадоў, калі Беларускі пасольскі клуб быў падзелены на дзве часткі і ўтварылася падкантрольная КПЗБ Грамада. У сярэдзіне лета 1928 г. прадстаўнікі савецкай дыпламатыі ў Польшчы мелі вялікі ўплыў на беларускі рух і падтрымлі-

валі сувязі як з пракамуністычнымі, так і з нацыянальна-дэмакратычнымі беларускімі дзеячамі. Планавалася нават аб’яднаць беларускіх прадстаўнікоў у новым сейме, аднак і гэты варыянт развіцця падзей у канчатковым выніку быў накіраваны на дыскрэдытацыю Ф. Ярэміча [8, с. 35].

Акрамя чыста палітычных кампаній савецкія дыпламаты арганізоўвалі і акцыі помсты ў дачыненні да непажаданых асобаў, як гэта было з М. Гурыным-Маразоўскім. Савецкі паўнамоцны прадстаўнік у Варшаве А. Загорны 19.06.1926 г. у лісце ў Прадстаўніцтва ЦК КПЗБ настойліва рэкамендаваў «пры абставінах, якія склаліся, Стаха (М. Гурын-Маразоўскі. – *А.С.*) пастарацца неадкладна прыбраць з гарызонта. Зразумейце, што ён ведае Роберта, Дзіка, Корчыка (партыйныя псеўданімы дзеячаў КПЗБ. – *А.С.*) і ўсіх, і што ён саромецца не будзе» [14, арк. 128]. Вядома, што М. Гурын-Маразоўскі пасля няўдалай спробы рэалізаваць свае палітычныя планы быў абвінавачаны камуністамі ў супрацоўніцтве з дэфензівай і 16 сакавіка 1928 г. забіты як правакатар С. Клінцэвічам. Прыклады адкрытага запалохвання і шантажу беларускіх дзеячаў – членаў Грамады, якія пасля забароны арганізацыі і пераследу польскай уладай адышлі ад супрацоўніцтва з камуністамі, – пацвярджаюць, што рэпрэсіўныя памкненні прадстаўнікоў камінтэрнаўскіх сілаў не абмяжоўваліся прыведзеным актам помсты. Камуністы баяліся, што важная інфармацыя аб дэталях іх шырокага нелегальнага пранікнення ў грамадска-палітычнае жыццё можа стаць вядомай польскім уладам, таму пагражалі фізічнай распраўай тым сваім былым саюзнікам, якія валодалі адпаведнай інфармацыяй і маглі патэнцыяльна стаць крыніцай для дэфензівы. Так, Войцік (верагодна, А.І. Войцік, рэдактар-выдавец газеты «Сялянская праўда» [11]) на пагрозы аб прыгатаваным для яго «лёсе ГУРЫНА», адказаў, што «на выпадак яго смерці ўсё паднаготнае будзе напісана ў некалькіх лістах і будзе ляжаць у надзейных асоб, і пасля смерці ўсё будзе апублікавана, дзякуючы чаму праціўнікі пабаяцца яго застрэліць». Па словах А.І. Войціка, забойства «было б ужо зроблена з Астроўскім, калі б «там» (у кіраўніцтве КПП–КПЗБ. – *А.С.*) не ведалі, што ў Астроўскага ўсё падрыхтавана да апублікавання на выпадак яго забойства» [13, арк. 38]. Напэўна, інфармацыя, якой валодалі Р. Астроўскі, А. Войцік і іншыя, была настолькі канфідэнцыйнай, што валоданне ёй захавала жыццё гэтым і, магчыма, іншым дзеячам беларускага нацыянальнага руху. Што, аднак, не пазбавіла Р. Астроўскага ад вялікай колькасці бруду, які канцэнтраваўся ў камуністычных асяродках і змяшчаўся на старонках пракамінтэрнаўскіх выданняў [13, арк. 66–78].

У публікацыях была даказана шырока ўжывальная практыка фінансавання савецкімі дзяржаўнымі ўстановамі апазіцыйных арганізацый у Заходняй Беларусі. Менавіта пытанні фінансавання савецкім бокам беларускіх арганізацый займалі важнае месца ва ўзаемаадносінах паміж прадстаўнікамі беларускага руху і іх партнёрамі з БССР. Так, напрыклад, з дзяржаўных сродкаў БССР, паводле каштарысу на 1926–1927 гг., на КПЗБ выдзялялася 468 365 руб. Пры гэтым на ўтрыманне арганізацый ЦК КПЗБ выдаткоўвалася 153 тыс. руб. на год: на школу КПЗБ, дапамогу Беларускай школьнай радзе, беларускім гімназіям, газеце, спартыўным арганізацыям, на прадстаўніка КП(Б)Б і КПЗБ у Варшаве, прадстаўніцтва КПЗБ у БССР [18, с.70–71].

Нельга выключаць савецкай фінансавай складовай у дзейнасці іншых арганізацый, а таксама перыядычных выданняў у Заходняй Беларусі. Так, напрыклад, паводле В. Пануцэвіча, у «канцы 1935 г. Масква мантавала ў заходніх краінах і ў Заходняй Беларусі так званы «народны фронт», быццам супрацьвагу на рост нацыяналізму й фашызму. У запраўднасці гэта была маскоўская надбудоўка для праводжаньня сваіх сымпатыяў, чаго нельга было рабіць пад камуністычнай ці сацыялістычнай вывескай. У Вільні прамоўтарам «народнага фронту» была група левых Дэмбінскага, што выдавала часопіс «Папросту». Група гэтая спагадна выказвалася да беларускага вызвольнага

руху ды востра крытыкавала польскую шавіністычную палітыку. Кс. Станкевіч сымпатызаваў гэтай групе…» [17, с. 64]. Цалкам магчыма, названыя дзеячы атрымлівалі фундацыі ад савецкіх прадстаўніцтваў, у тым ліку і А. Станкевіч, да якога бальшавіцкія агенты звярталіся з прапановай аб супрацоўніцтве яшчэ ў сярэдзіне 1920-х гадоў [21, с. 525]. Верагодна, гэта можна сказаць і аб іншых выданнях, напрыклад двухтыднёвіку «Асва», які пачаў выходзіць з сакавіка 1934 г. і галоўным аб'ектам крытыкі абраў розных «нацыянал-здраднікаў, кшталту Луцкевіча, Астроўскага, Клімовіча, Станкевіча, а таксама наваспечаных нацдэмаў з ТБШ Шырмы і Марцінчыка. Ідэалагічны падтэкст артыкулаў «Асвы» прасочваўся лёгка: кампраметацыя беларускага нацыянальна-вызваленчага руху» [3]. Пытанні ўнушальнай арганізацыйна-кадравай (перакід на кіраўнічыя пасады ў КПЗБ грамадзян БССР, навучанне кадраў у школе КПЗБ), матэрыяльна-тэхнічнай (дзейнасць друкарні КПЗБ, выданне падпольнай літаратуры, перакід зброі і да т.п.), фінансавай (як з дапамогай сродкаў самой БССР, так і Масквы) дзейнасці сістэматызавана і абгрунтавана прадстаўлены ў кандыдацкай дысертацыі В.М. Цынкевіча [21; 22]. Больш падрабязную інфармацыю пра фінансаванне КПЗБ савецкімі дзяржаўнымі і грамадскімі органамі можна атрымаць у некаторых архіўных справах у фондзе Прадстаўніцтва ЦК Кампартыі Заходняй Беларусі [14; 16].

**Заключэнне**

Такім чынам, у 1990–2000-я гг. айчынная гістарыяграфія гісторыі Заходняй Беларусі ажыццявіла паварот да асэнсавання шматаспектных пытанняў, якія накіраваны на асэнсаванне ролі асобаў – дзеячаў беларускага нацыянальна-вызваленчага руху ў кантэксце складаных і драматычных фактараў. Ва ўмовах знаходжання на лініі вострага супрацьстаяння паміж польскімі і прасавецкімі сіламі беларускія палітычныя дзеячы вымушаны былі рэагаваць на разнастайныя звароты не толькі прадстаўнікоў гэтых накірункаў, але літоўскіх, нямецкіх і іншых уплывовых палітыкаў. Гэта прыводзіла да трансфармацыі поглядаў і тактыкі беларускіх арганізацый, якія, атрымліваючы разнастайную падтрымку, у тым ліку арганізацыйна-фінансавую, траплялі пад кантроль чужых сілаў. У выніку беларусы станавіліся закладнікамі палітычнай кан'юнктуры, навязанай ім звонку, заўзята адстойвалі чужыя інтарэсы насуперак інтарэсам беларускай справы, актыўна ажыццяўлялі шальмаванне палітычных апанентаў – беларускіх дзеячаў і ў рэшце рэшт самадыскрэдытацыю. Прадстаўнікі савецкай гістарычный навукі актыўна выкарыстоўвалі негатыўныя фармулёўкі ў дачыненні да прадстаўнікоў беларускага нацыянальна-дэмакратычнага крыла, якія сфарміраваліся ва ўмовах вострага ідэйна-палітычнага супрацьстаяння, усталёўваючы ў якасці асноўнай думку аб варожасці і здрадніцтве беларускіх палітыкаў, якія дэманстравалі альтэрнатыўныя камуністычным ідэям погляды. Такія метадалагічныя падыходы прыводзілі да спрашчэння і прымітывізацыі грамадска-палітычнай гісторыі Заходняй Беларусі. На працягу 1990–2000-х гг. айчынная гістарыяграфія здолела стварыць трывалы навукова-метадалагічны падмурак, у тым ліку крыніцазнаўчыя падставы, для стварэння праўдзівага вобраза актыўных удзельнікаў заходнебеларускага нацыянальна-вызваленчага руху. Навуковы аналіз узаемаадносін удзельнікаў грамадска-палітычных працэсаў, адносін з афіцыйнымі ўрадавымі і праўрадавымі арганізацыямі, стаўлення да разнастайных дзяржаўных мерапрыемстваў, дыскусій па розных пытаннях палітычнай дзейнасці, асэнсаванне ўплыву на беларускіх дзеячаў на падставе разнастайных ідэалагічных і сацыяльна-эканамічных дактрын, вырашэння фінансава-матэрыяльных пытанняў дазволілі своеасаблівым чынам «ажывіць» гісторыю Заходняй Беларусі. Гэта дазволіла ажыццявіць чарговы этап гістарычнай рэабілітацыі тых асобаў, якія, не з'яўляючыся саюзнікамі і паплечнікамі кампартыі, на працягу 1920–1980-х гг. незаслужана мелі абразлівыя ярлыкі здраднікаў, згоднікаў, ворагаў беларускага народа.

СПІС ЛІТАРАТУРЫ

1. Адамушка, У.І. Ігнат Дварчанін – рэвалюцыянер, гісторык, паэт / У.І. Адамушка // Беларус. гістарычны часопіс. – 1993. – № 3. – С. 113–119; Адамушка, У. … І пачаць будаўніцтва дзяржавы нашай [Пра С.А. Рак-Міхайлоўскага] / У. Адамушка // Беларус. мінуўшчына. – 1996. – № 3. – С. 26–29; Адамушка, У.І. Язэп Амяльянавіч Гаўрылік / У.І. Адамушка // Беларус. гістарычны часопіс. – 1995. – № 2. – С. 174–182; Бергман, А. Слова пра Браніслава Тарашкевіча. Гістарычны жыццяпіс / А. Бергман. – Мінск : Маст. літаратура, 1996; Бандарэнка, М. Ігнат Дварчанін / М. Бандарэнка // Полымя. – 2000. – № 6. – С. 116–129; Иоффе, Э.Г. Сергей Притыцкий: хроника жизни / Э.Г. Иоффе // Беларус. думка. – 2008. – № 6. – С. 92–97; Цуба, М.В. В.З. Корж: невядомыя і малавядомыя старонкі жыцця / М.В. Цуба. – Пінск : «Паляшук», 2009. – 88 с.

2. Аўтабіяграфія Браніслава Адамавіча Тарашкевіча, члена КПП (КПЗБ) з 1925 года / прадмова А. Валахановіча, У. Міхнюка ; стылізаваны пераклад Ю. Бушлякова, В. Караткевіч // Спадчына. – 1996. – № 4. – С. 92–132; № 5. – С. 130–186.

3. Вашкевіч, А. Нашы сцягі над Заходняй / А. Вашкевіч // ARCHE Пачатак. – 2007. – № 4 [Электронны рэсурс]. – Рэжым доступу: http://arche.bymedia.net/2007-04/vaskievic704.htm. – Дата доступу: 03.04.2012.

4. Гигин, В. Кризис белорусской национально-демократической оппозиции в 1921–1925 гг. / В. Гигин // Гісторыя: праблемы выкладання. – 2002. – № 3. – С. 36–46; № 4. – С. 49–59.

5. Грыцкевіч, А. Заканчэнне савецка-польскай вайны ў другой палове 1920 г. і постаць генерала Булак-Балаховіча / А. Грыцкевіч // Спадчына. – 1995. – № 5. – С. 90–115.

6. Дзяржаўны архіў Брэсцкай вобласці (ДАБВ). – Фонд. 67. – Воп. 4. – Спр. 27. Приказы, распоряжения командования о деятельности пинской экспозитуры и сообщения о политическом движении на территории пинской экспозитуры.

7. Знешняя палітыка Беларусі : зб. дакументаў і матэрыялаў. – Т. 2: 1923–1927 гг. / склад. У.М. Міхнюк [і інш.]. – Мінск, 1999. – 461 с.

8. Знешняя палітыка Беларусі : зб. дакументаў і матэрыялаў. – Т. 3: 1928 – чэрвень 1941 г. / склад. У.М. Міхнюк [і інш.]. – Мінск, 2001. – 321 с.

9. Лазько, Р. Перад патопам (Еўрапейская палітыка Польшчы. 1932–1939 гг.) / Р. Лазько. – Мінск : БДУ, 2000. – 354 с.

10. Лазько, Р. Хто ж знішчыў «Грамаду»? / Р. Лазько // Беларус. мінуўшчына. – 1994. – № 2. – С. 46–49.

11. Ліс, А. Войцік Антон Іванавіч / А. Ліс // Энцыклап. гісторыі Беларусі : у 6 т. / рэдкал.: Г.П. Пашкоў (гал. рэд.) [і інш.] – Мінск : БелЭН, 2003. – Т. 6, кн. 2: Усвея–Яшын; Дадатак. – С. 358–359.

12. Мезга, М. Мяжа канфрантацыі (становішча Заходняй Беларусі пасля падпісання Рыжскай дамовы 1921 г.) / М. Мезга // Беларус. мінуўшчына. – 1996. – № 2. – С. 29–31.

13. Нацыянальны архіў Рэспублікі Беларусь (НАРБ). – Фонд 242п. – Воп. 1. – Спр. 153. Материалы о руководстве партии национально-освободительным движением (протоколы, циркуляры, резолюции, письма и др.) (1927–1932).

14. НАРБ. – Фонд 242п. – Воп. 1. – Спр. 86. Письма ЦК КПЗБ в Представительство.

15. НАРБ. – Фонд 242п. – Воп. 2. – Спр. 11. Переписка секретного отдела Центрального бюро КП(б) Белоруссии с Белостокским окружным комитетом КП(б) Белоруссии о положении в Белостоке, по персональным и другим вопросам.

16. НАРБ. – Фонд 242п. – Воп. 2. – Спр. 44. Отчет Представительства Компартии Западной Белоруссии о работе за период с 15 апреля по 15 ноября 1925; Спр. 118. Приходно-расходная книга (представительства Компартии Западной Белоруссии) с указанием фамилий и кличек членов партии (1927–1928).

17. Пануцэвіч, В. Кс. Вінцэсь Гадлеўскі / В. Пануцэвіч // Спадчына. – 1993. – № 3. – С. 51–72; № 5. – С. 81–94; № 6. – С. 69–85.

18. Протько, Т.С. Становление советской тоталитарной системы в Беларуси (1917–1941 гг.) / Т.С. Протько. – Минск : Тесей, 2002. – 688 с.

19. Розенблат, Е.С. Дискуссия о С. Булак-Балаховиче продолжается… / Е.С. Розенблат, И.Э. Еленская // Берасцейскі хранограф : зб. навук. прац. – Вып. 3. – Брэст : Выд-ва С.Б. Лаўроў, 2002. – С. 391–398; «Степень достоверности – достоверно...»: ар-мія Булак-Балаховіча і антысавецкі «супраціў» 1921–1927 гадоў у дакументах ВЧК (АДПУ) / падрыхт. Алег Ліцкевіч // Беларус. думка. – 2008. – № 6. – С. 54–59; № 7. – С. 86–91; Чарнякевіч, А. Кароткі нарыс гісторыі ўзаемаадносін беларускага нацыя-нальнага руху і II аддзела Галоўнага камандавання (Генеральнага штаба) Войска Польскага ў 1918–1923 гг. / А. Чарнякевіч, А. Пашкевіч // ARCHE Пачатак. – 2009. – № 8. – С. 22–73.

20. Сидоревич, А. Антон Луцкевич : главы из книги / А. Сідоревіч // Нёман. – 1990. – № 7. – С. 91–167; Сідарэвіч, А. З жыцця Антона Луцкевіча. Артыкул першы. Маёнтак / А. Сідарэвіч // ЛІМ. – 1991. – 18 студзеня. – № 3. – С. 13–14; Сідарэвіч, А. З жыцця Антона Луцкевіча. Артыкул другі. Астрожныя запісы / А. Сідарэвіч // ЛІМ. – 1991. – 25 студзеня. – № 4. – С. 12–13; Сідарэвіч, А. З жыцця Антона Луцкевіча. Артыкул трэці. Расправа / А. Сідарэвіч // ЛІМ. – 1991. – 1 лютага. – № 5. – С. 13, 15; Лабынцев, Ю. Витебчанин Вячеслав Богданович – белорусский сенатор II Речи Посполитой: церковная, политическая и литературная деятельность / Ю. Лабынцев // Беларуска-руска-польскае супастаўляльнае мовазнаўства і літаратуразнаўства : зб. матэрыялаў IV міжнар. навук. канф., Віцебск, 24–26 красавіка 1997 г. – Віцебск : Выд-ВА. ВДУ, 1997. – Ч. 2. – С. 286–288; Луцкевіч, Л. Аляксандар Уласаў / Л. Луцкевіч, Г. Войцік. – Вільня, 2001. – 18 с.; Вашкевіч, А. Сымон Якавюк: адраджэнец, спекулянт, манархіст і савецкі дыверсант / А. Вашкевіч, Д. Нарэль // ARCHE Пачатак. – 2005. – № 5. – С. 176–232; Вашкевіч, А. Ксёндз Адам Станкевіч / А. Вашкевіч // Куфэрак Віленшчыны. – 2005. – № 1 (10). – С. 4–35; Смалянчук, А. Жыццё і смерць Рамана Скірмунта (паводле вусных успамінаў жыхароў Піншчыны) / А. Смалянчук // Białoruskie Zeszyty Historyczne. – 2002. – Zesz. 18. – S. 214–222; Ільін, А. Раман Скірмунт у грамадска-палітычным і культурным жыцці Піншчыны ў 20–30-я гг. XX ст. / А. Ільін // Гістарычны альманах. – 2003. – Т. 8. – С. 98–106; Конан, У. Ксёндз Вінцэнт Гадлеўскі : Філасофскае абгрунтаванне беларускай ідэі / У. Конан [Электронны рэсурс]. – Рэжым доступу: http://jivebelarus.net/history/faces/priest-vincent-hadleuski-philosophic-bases-of-belarusian-idea.html. – Дата доступу: 25.10.2008; Лабынцаў, Ю. Хрысціянская любоў і культура супраць насілля: духоўная спадчына В. Багдановіча ў нашы дні (Беларусь, Літва, Польшча, Расія) / Ю. Лабынцаў, Л. Шчавінская // Разнастайнасць моў і культур у кантэксце глабалізацыі : матэрыялы Міжнар. сімпозіума, Мінск, 9–10 ліп. 2002 г. : у 2 кн. / Рэдкал.: А. Мальдзіс (гал. рэд.) [і інш.]. – Мінск : Чарнобыль, 2003. – Кн. 2 – С. 207–221; Пашкевіч, А.В. Аляксандр Уласаў як беларускі палітык у міжваеннай Польшчы / А.В. Пашкевіч // Асоба ў гісторыі. Гераічнае і трагічнае : матэрыялы II Міжнар. навук.-практ. канф. студэнтаў, аспірантаў і маладых вучоных, прысвеч. памяці праф. У.У. Мелішкевіча, 12–13 лістапада 2004 г. – Брэст : Акадэмія, 2006. – С. 214–219; Грыцкевіч, В. Справа аб замаху Барыса Каверды на Пятра Войкава. Яшчэ адзін міф пра этнічнага беларуса / В. Грыцкевіч // ARCHE Пачатак. – 2006. – № 11. – С. 116–128; Ліс, А. Gloria victis! : Зб. твораў / А. Ліс. – Мінск : І.П. Логінаў, 2010. – 754 с.; Расстраляная літаратура : творы беларус. пісьменнікаў, загубленых карнымі органамі бальшавіцкай улады / уклад. Л. Савік, М. Скоблы, К. Цвіркі, прадм. А. Сідарэвіча, камент. М. Скоблы, К. Цвіркі. – Мінск : Кнігазбор, 2008. – 696 с.; Смалянчук, А. Палескія Скірмунты: трагедыя восені 1939 года / А. Смалянчук // ARCHE Пачатак. – 2011. – № 3. – С. 401–409.

21. Станкевіч, А. З Богам да Беларусі : зб. твораў / А. Станкевіч ; укл., навук. рэд., камент., прадм. А. Пашкевіч, А. Вашкевіч. – Вільня : Інстытут беларусістыкі, 2008. – 1098 с.

22. Цынкевіч, В.М. Палітычныя ўзаемадачыненні паміж БССР і Польскай Рэспублікай у 1921–1929 гг. : аўтарэф. дыс. … канд. гіст. навук: 07.00.15 / В.М. Цынкевіч ; Беларус. дзярж. ун-т. – Мінск, 2004. – 20 с.; Цынкевіч, В.М. Палітычныя ўзаемадачыненні паміж БССР і Польскай Рэспублікай у 1921–1929 гг. : дыс. … канд. гіст. навук: 07.00.15 / В.М. Цынкевіч. – Мінск, 2004. – 127 с.

23. Чарнякевіч, А. Псіхалогія здрады: беларускі нацыянальны рух вачыма канфідэнта II аддзела польскага Генеральнага штаба / А. Чарнякевіч, А. Пашкевіч // ARCHE Пачатак. – 2005. – № 6. – С. 214–271.

***Savich A.A.*** **Personalities of Western Belarusian Liberation Movement (1921–1939) Reflected in Native Historiography of 1990–2000**

In this article, based on a broad range of historiographic sources the questions concerning the role and place of Western Belarusian figures in the national liberation movement of 1921-1939 years in the works of historians are investigated. Soviet historical science, with its class and party priorities had sharply negative attitude to the activities of politicians of noncommunist orientation in Western Belarus, in the 1930-1950s; even devotees of the Communist Party leaders were persecuted, and their work served as a business of dyfenzivy agent. At the time of the Republic of Belarus national historiography managed to accumulate solid foundation of scientific and methodological work to reconsider the activity of Belarusian politicians, their historical rehabilitation, including in the context of national history.

Рукапіс паступіў у рэдкалегію 26.06.2012